# ОБЗОРЫ И РЕЦЕНЗИИ

## СТРАТЭГІІ ВЫЖЫВАННЯ ЯЎРЭЙСКІХ ВЯЗНЯЎ ВА ЎМОВАХ НАЦЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ БЕЛАРУСІ (1941–1944)

*Reichelt, Katrin*. Der Wald war ein letzter Ausweg: Hilfe für verfolgte Juden im deutsche besetzten Weißrussland 1941–1944 / Katrin Reichelt. – Berlin : Lukas Verlag, 2017. – 446 S[1].

Манаграфія, прысвечаная гісторыі выжывання ці выратавання беларускіх яўрэяў ва ўмовах германскай акупацыі Беларусі 1941–1944 гг., стала вынікам шматгадовай працы нямецкага гісторыка Катрын Райхельт над тэмай людской дапамогі тым, хто знаходзіўся ў фокусе нацысцкай палітыкі татальнага вынішчэння ў рамках ажыццяўлення нацысцкай праграмы «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання» на акупаваных усходніх тэрыторыях, у тым ліку ў Беларусі.

Даследчыца выкарыстала гістарыяграфічныя і дакументальныя крыніцы з розных архіўных, бібліятэчных і ўласных фондаў у Беларусі, Германіі, ЗША і Ізраіля, у тым ліку асабістага паходжання, для таго, каб на сучасным узроўні навуковых ведаў раскрыць малавядомую карціну гістарычных падзей, звязаных з пошукам стратэгіі выжывання вязняў яўрэйскіх гета. Спроба даследчыцы паказаць факты існавання такіх стратэгій і раскрыць дэталі выратавання (нават ва ўмовах татальнага праследу яўрэяў у гарадах, мястэчках і вёсках акупаванай Беларусі) заслугоўвае асаблівай павагі ў сучаснага чытача, які адзначае: па-першае, дэталёвы паказ нацысцкага генацыду яўрэйскага насельніцтва на прыкладзе асабістых лёсаў яўрэяў Беларусі; па-другое, увядзенне ў навуковы зварот малавядомых аспектаў гісторыі выжывання яўрэяў; па-трэцяе, атрыманне адказаў на малавядомыя пытанні гісторыі Халакосту ў Беларусі 1941–1944 гг. Выкананае ў арыгінальным стылі даследаванне можна кваліфікаваць як адметную навуковую каштоўнасць сучаснай беларускай і германскай гістарыяграфіі.

Выданне складаецца з дзвюх асноўных частак. Першую ўтвараюць аўтарскія «заўвагі», якія прапануе К. Райхельт у дачыненні да гісторыі германскай акупацыі, правядзення нацысцкай палітыкі вынішчэння беларускіх яўрэяў і выяўлення маштабаў іх выратавання на тэрыторыі краіны ў 1941–1944 гг. Аснову другой складаюць асабістыя гісторыі яўрэяў, якія здолелі не толькі знайсці стратэгіі выжывання, але і раскрыць доўгія шляхі да ратавання ці самавыратавання жанчын, дзяцей, людзей розных узростаў, што для іх з'яўлялася «сапраўдным цудам». У выкарыстанай аўтарам структуры чытач знойдзе спіс літаратуры, уведзеныя скарачэнні, а таксама пералік асабістых імёнаў, факсіміле арыгінальных эгаматэрыялаў, гістарычных карт і фотаздымкаў. Як асаблівую заслугу аўтара неабходна адзначыць яе

[1] Аўтар артыкула выказвае шчырую падзяку І. Петц і А. Белановіч-Петц за сяброўскі дарунак гэтай кнігі на нямецкай мове.

імкненне да пераносу акцэнту ў даследаванні з выключна дакументальных крыніц на малавядомыя звесткі, часта ўласнага паходжання, у тым ліку на ўспаміны тых, хто ратаваў, і каго ратавалі, людзей розных нацыянальнасцей і веравызнанняў.

Першую частку складаюць 5 асобных раздзелаў (S. 7–87), прысвечаных паказу гістарычнага ландшафту Беларусі (S. 7–9), правядзенню на гэтай тэрыторыі нацысцкай акупацыйнай палітыкі ў 1941–1944 гг. (S. 12–27), раскрыццю гісторыі, пераследу і знішчэнню беларускіх яўрэяў (S. 30–50), высвятленню маштабаў іх выратавання ва ўмовах правядзення татальных злачынстваў і вынішчэння (S. 51–70), фактаў супрацiўлення і самавыратавання (S. 71–87).

Даследчыца знаёміць чытача з хронікай гістарычных падзей, якія вызначылі адметнасць развіцця дзяржаўнага ландшафту Беларусі цягам часу з 1 студзеня 1919 г. да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар прыходзіць да высновы, што напярэдадні германскай агрэсіі на беларускай тэрыторыі пражывалі да 10 млн чалавек, сярод якіх большасць складалі беларусы, палякі, рускія, яўрэі і татары. Нягледзячы на правядзенне палітыкі па збліжэнні нацый у савецкай краіне ва ўсходняй частцы Беларусі назіралася даволі стракатая этнічная карціна, Германскі вермахт напаўшы на СССР 22 чэрвеня 1941 г., распачаў праводзіць палітыку вынішчэння. Разам з яўрэйскім насельніцтвам, якое падлягала татальнаму вынішчэнню, такая ж палітыка жаху і забойстваў праводзілася ў дачыненні да мясцовага грамадзянскага насельніцтва. Нацысцкая дактрына «заваявання і знішчэння» пачала праводзіцца на акупаванай тэрыторыі Беларусі ва ўсіх праявах жорсткасці (S. 12). Вынікам правядзення нацысцкай палітыкі татальнага вынішчэння стала пераўтварэнне беларускай краіны ў спустошаны край, дзе была знішчана чвэрць насельніцтва, асноўную частку якой складалі беларускія яўрэі. Толькі ў Мінску былі забіты амаль 100 тысяч яўрэяў, у тым ліку яўрэі мінскага гета і яўрэі з Аўстрыі, Германіі, Чэхаславакіі (S. 27). Кранае ў кнізе фотаздымак, змешчаны на ўвесь разварот, – гэта Маша Брускіна разам з іншымі ўдзельнікамі гарадскога супраціўлення перад іх публічным пакараннем 26 кастрычніка 1941 года.

У наступным падраздзеле аўтар дае агульную замалёўку гісторыі, пераследу і знішчэнню беларускіх яўрэяў у гады германскай акупацыі. Экскурс у гісторыю дазваляе аўтару звярнуцца да вытокаў засялення яўрэяў на беларускай зямлі ў часы Вялікага Княства Літоўскага. Праз паўтысячы гадоў (у канцы XIX стагоддзя) яўрэі ў асобных гарадах складалі большую частку насельніцтва. Калі ў Мінску, Віцебску і Гомелі доля яўрэйскага насельніцтва дасягала паловы, то ў Пінску іх было звыш 70 % (S. 30). Даследчыца, са спасылкай на выяўленае ў фондах Нацыянальнага архіва ЗША ў Вашынгтоне паведамленне № 33 ад 27.07.1941 г., падрыхтаванае ў якасці данясення з акупаванай усходняй тэрыторыі айнзацгрупай Б, прыводзіць агульную лічбу яўрэяў, якія перад нападам вермахта пражывалі ў Беларусі – каля 820 тысяч чалавек (S. 34). Як мяркуе К. Райхельт, з улікам тых, хто ў якасці бежанцаў апынуўся на тэрыторыі савецкай Беларусі пасля

падзей 1939 г., гэта лічба магла быць значна большай і вагацца ад 900 да 1,5 млн яўрэйскага насельніцтва (S. 34). На гэтай жа старонцы даследчыца піша пра той факт, што Мінск быў захоплены сіламі германскага люфтваффе цягам двух дзён, 27 і 28 ліпеня 1941 года. Заўважым, што насамрэч гэта адбылося ў другой палове дня 28 ліпеня з удзелам 20-й танкавай дывізіі вермахта пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Х. Штумпфа[1]. Як паказана ў даследаванні, з пачаткам акупацыі Беларусі распачалася трагічная гісторыя беларускіх яўрэяў, для якіх ствараліся часовыя месцы знаходжання перад тым, як людзей знішчыць (S. 39). У пачатку жніўня айнзацгрупа Б паведамляла ў чарговым данясенні аб тым, што на той момант былі ліквідаваны не менш чым 30 яўрэйскіх гета у раёнах Мінска, Шклова, Іўя, Слуцка, Чэрнеўкі, Грэска, Магілёва, Лапіч, Чэрвеня і Барысава. У верасні пачалася сістэматычная ліквідацыя яўрэйскіх абшчын у малых мястэчках паміж Мінскам і Барысавам, потым Лагойска, а таксама ў раёне Лепеля і Мар'інай Горкі, Чавусах і Чэрнеўкі. Наступнай фазай стала «татальнае знішчэнне», якое праводзілася з пачатку кастрычніка 1941 г., калі былі ліквідаваны вялікія гета ў Магілёве (2 і 3 кастрычніка – 2 273 яўрэяў, 19 кастрычніка – 3 726), у Віцебску (пачынаючы з 8 кастрычніка звыш 4 000 чалавек), Полацку (ад 7 000 да 8 000), Гомелі (19 кастрычніка – 3 726 і ў лістападзе звыш 2 000), Бабруйску (звыш 6500), Оршы (звыш 2000 яўрэяў) (S. 41). Да канца лістапада 1941 г. у Беларусі былі ліквідаваны малыя гета. Адпаведна данясенняў айнзацгрупы Б, да пачатку зімы 1941/42 г. яе падраздзяленні разам з часцямі вермахта і паліцыі бяспекі, у тым ліку з мясцовай паліцыяй, забілі амаль дзве трэці ўсіх беларускіх яўрэяў. Паводле тых жа данясенняў, на 28 лютага 1942 г. лічба забітых складала 91 012 яўрэяў. У далейшым падраздзяленні групы прымалі ўдзел у ліквідацыі партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі, дзе ахвярай даволі часта з'яўлялася мясцовае грамадзянскае насельніцтва.

У такіх умовах адной з важных стратэгій выжывання яўрэйскага насельніцтва станавілася прымусовая праца, якая заключалася ў прыцягненні працаздольных мужчын і жанчын для ліквідацыі разбурэнняў у гарадах пасля масіўных нямецкіх бамбардзіровак. Аднак на справе, як адзначае даследчыца, прымусовая праца не давала гарантыі выжывання, таму з'яўлялася «ілюзіяй» для значнай часткі яўрэяў, у тым ліку з Мінскага гета (S. 48). Сярод месцаў знішчэння яўрэяў гета, у тым ліку каля 18 тысяч дэпартаваных з тэрыторыі рэйху, а таксама іншых груп мясцовага насельніцтва ў працы згадваецца лагер смерці Малы Трасцянец пад Мінскам. Даследчыца пагаджаецца з думкай нямецкіх гісторыкаў, якія прыводзяць агульную лічбу ахвяр у гэтым лагеры не больш за 60 тысяч чалавек (S. 48). У дачыненні да агульнай лічбы ахвяр сярод яўрэйскага насельніцтва К. Райхельт прытрымліваецца думкі, што амаль 65 % беларускіх яўрэяў не перажылі гэтыя негатыўныя праяўленні нацысцкай палітыкі (S. 50).

[1] *Воронкова, И. Ю.* Минск: лето 1941, лето 1944 / И. Ю. Воронкова. – Минск: Бел. навука, 2014. – С. 268.

Абставіны германскай акупацыі пакінулі беларускім яўрэям толькі адну альтэрнатыўную стратэгію для выжывання – удзел у арганізаваным супраціўленні (с. 53). Для гэтага неабходна было перш за ўсё уцячы з гета, каб апынуцца ў партызанскім атрадзе. У якасці выключэнняў даследчыца прыводзіць факты выратавання яўрэяў беларускімі сялянамі, якія рабілі гэта з вялікай рызыкай для ўласнага жыцця. Адной з важных рыс такіх людзей аўтар называе здольнасць да самаахвяравання (S. 70).

Адным з фактаў калектыўнага супраціўлення і самавыратавання для яўрэяў сталі іх уцёкі з гета ў раёне Мінска і Навагрудка, дзе яўрэям удалося нават стварыць уласныя партызанскія атрады, або быць прынятым у склад іншых партызанскіх фарміраванняў. У якасці такога прыкладу даследчыца называе партызанскі атрад «імя Кутузава», палову якога складалі былыя яўрэйскія вязні гета. З ліку найбольш вядомых партызанскіх фарміраванняў, створаных выключна з яўрэяў, у кнізе называецца атрад пад камандаваннем братоў Бельскіх (Тувій, Жус і Асаэль), які дзейнічаў у раёне Ліды, Баранавіч і Навагрудка. Другі партызанскі атрад, вядомы пад нумарам 106, узначальваў Шлома Зорын (S. 77). Паводле вядомых дакументаў, у яго склад ўваходзілі 558 чалавек, з якіх узбраенне мелі толькі 137 чалавек, гэта былі тыя, хто ахоўваў уцекачоў у лагеры. Як сказана ў працы, галоўным прыярытэтам для такіх партызанскіх атрадаў з’яўлялася забеспячэнне магчымасці для выратавання як мага большай колькасці людзей (S. 81), а не вядзенне ўзброенай барацьбы супраць акупантаў. Падобнай стратэгіі прытрымліваўся і партызанскі атрад пад камандаваннем братоў Бельскіх. У кнізе згадваецца прозвішча яшчэ аднаго камандзіра партызанскага атрада М. Кісялёва, дзякуючы якому былі выратаваны 218 яўрэйскіх мужчын, жанчын і дзяцей (S. 85). Як заключае К. Райхельт, трагедыя знішчэння беларускіх яўрэяў скончылася толькі з канчатковым вызваленнем тэрыторыі Беларусі Чырвонай арміяй.

У другой частцы даследавання аўтар прыводзіць 11 аўтабіяграфічных матэрыялаў ці ўспамінаў, з якіх пяць раскрываюць асобныя факты з гісторыі выратавання яўрэяў, у тым ліку: Леаніда Рудэрмана (S. 89–108), дзяцей Мінскага гета ў вёсцы Парэчча (S. 11–158), Сімы Марголінай (S. 203–230), Зінаіды Краснер (S. 265–285), Ідэль Каган (S. 414–425) і Яфіма Гімельштайна (S. 425–432). Астатнія шэсць гісторый знаёмяць чытача з беларусамі, колькасць якіх вызначаецца лічбай амаль у тысячу чалавек, хто пад смяротнай пагрозай свайму жыццю ратаваў яўрэяў ці дапамагаў ім любым чынам выжыць. Сярод тых, хто прадстаўлены ў даследаванні, згадваюцца: беларусы Ганна, Валя і Віктар Чорныя (S. 159–185), сям’я Хачэўскіх (S. 187–200), сям’я Сямашка (S. 233–263), татарская сям’я Канапацкіх (S. 287–311), Вольга Плескач (S. 313–336). Адзін з расповедаў прысвечаны братам Тувію, Жусу і Асаэлю Бельскім, якія, уцёкшы ў лес, змаглі выратаваць вялікую колькасць яўрэяў з раёнаў Ліды, Навагрудка, Баранавіч і іншых месцаў (S. 339–411).

У якасці заключэння (с. 434–435) аўтар дае тлумачэнні некалькіх тэрмінаў рознага паходжання, у тым ліку: двух беларускіх – *хутар* і *зямлянка*, а таксама двух яўрэйскіх/габрэйскіх – *маліна* і *мальбушым*. Калі першыя два тэрміны беларускага паходжання чытачу знаёмы, дык два апошніх азначаюць: *маліна* ‘месца патаемнага знаходжання яўрэяў у час аблаў’; *мальбушым* ‘вопратка, якую насілі тыя яўрэі, хто не браў удзел ва ўзброенай барацьбе яўрэйскіх партызанскіх атрадаў’.

Такім чынам, знаёмства з новай працай, падрыхтаванай нямецкім даследчыкам К. Райхельт, дае магчымасць: 1) раскрыць малавядомыя аспекты гісторыі яўрэйскага выратавання ў Беларусі ў 1941–1944 гг.; 2) увесці ў навуковы зварот асабістыя гісторыі выратаваных і іх выратавальнікаў, вядомых на цяперашні час як беларускія праведнікі; 3) значна паглыбіць гістарычныя веды адносна падзей гісторыі генацыду беларускіх яўрэяў увогуле і асобных беларусаў у прыватнасці. У выніку аналізу манаграфічнага даследавання можна прыйсці да важнай высновы пра тое, што праца з’яўляецца новай крыніцай па даследаванні гісторыі нацысцкага Халакосту ў Беларусі.

***Сяргей Новікаў***
*кандыдат гістарычных навук*